

Аляксандр Лукашэнка ўручае ўзнагароду дырэктару Радашковіцкай школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, Ігару Дзятлоўскаму.

**Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА.**

## *Аляксандр ЛУКАШЭНКА:*

# "Беларуская культура павінна служыць крыніцай маральнага вопыту і асновай духоўнага яднання народа"

***Беларусь, дзякуючы маштабным творчым праектам, ператварылася ў адзін з цэнтраў культурнага жыцця Еўропы. Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння прэмій Прэзідэнта Беларусі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльных прэмій прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.***

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: "Не адно стагоддзе філосафы спрачаюцца аб тым, што важней: матэрыя або дух, узвышанае або зямное. І сёння, гледзячы на гэтую залу, дзе сабраўся цвет беларускай інтэлігенцыі, я мімаволі задаю сабе ўсё тое ж адвечнае пытанне. Бясспрэчна, без матэрыяльных даброт не можа існаваць род людскі. Але ў кожным з нас ёсць нешта, што цяжка апісаць словамі, нейкая Божая іскра, духоўны агонь, які прымушае мысліць і адчуваць, кахаць і пакутаваць, смела імкнуцца і ствараць".

Аляксандр Лукашэнка прадоўжыў: "Не хлебам адзіным жывы чалавек. Нават магутныя імперыі старажытнасці разбураліся і гінулі, калі пазбаўляліся сувязнай агульнасці ідэалаў, маральных асноў і веры — усяго таго, што ператварае насельніцтва ў народ, а месца-пражыванне — у Айчыну".

На думку прэзідэнта, у беларусаў сіла слова заўсёды цанілася вышэй за сілу зброі. Беларуская зямля нараджала не агрэсараў і прыгнятальнікаў, а асветнікаў, вучоных, мастакоў і паэтаў.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што народ Беларусі, які перажыў нямала гістарычных драм, ніколі не аддаваў забыццю сваю спадчыну, зберагаў паданні, помнікі, традыцыі і песні. І таму не знік у пясках часу, а застаўся самім сабой, пранёсшы праз стагоддзі гераічны характар і святыя запаветы продкаў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што невыпадкова свята Раждзества ў сучаснай Беларусі стала сімвалам адраджэння, вяртання да спрадвечных каштоўнасцей, якія вызначылі наш гістарычны шлях.

"Нашы духоўнасць, мастацтва, культура — гэта крывяносная сістэма грамадства, якая дае яму жыццёвыя сілы, — лічыць прэзідэнт. — Разумеючы гэта, дзяржава рабіла, робіць і будзе рабіць усё для прымнажэння гэтага найбагацейшага здабытку. Для таго, каб кожны талент квітнеў і ніводны творчы парыў не пагас. Каб кожны з вас, людзей выбраных, адзначаных асаблівым дарам, мог ажыццявіць свае задумы".

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, 2012 год даў яркія прыклады адраджэння і росквіту культуры. Аднаўлены Нясвіжскі палацава-паркавы ансамбль. Рэканструяваны Купалаўскі тэатр. Завяршаецца ўзвядзенне ўнікальнага комплексу — Музея Вялікай Айчыннай вайны.

Беларусь ператварылася ў адзін з цэнтраў культурнага жыцця Еўропы дзякуючы маштабным міжнародным фестывалям, выставам, творчым праектам, якія ахапілі ўсе напрамкі мастацтва — ад фальклору і высокай класікі да авангарда. Перамогі маладых артыстаў на прэстыжных конкурсах праславілі краіну, можна ганарыцца тым, наколькі багатая на таленты беларуская зямля.

"Нездарма кажуць, што найвышэйшая задача таленту — сваімі творамі даць людзям зразумець сэнс і цану іх існавання. Культура і духоўнасць вызначаюць жыццё грамадства, наша стаўленне да працы, адно да аднаго, да дзяцей і, нарэшце, да Айчыны, — адзначыў прэзідэнт. — Без культуры няма свабоды. Там, дзе адсутнічаюць маральныя бар'еры, свабода выраджаецца ў жорсткую, разбуральную сілу, анархію. Сапраўды свабодным можа лічыцца толькі чалавек, здольны да маральнай самадысцыпліны".

Аляксандр Лукашэнка прадоўжыў: "Нам, беларусам, нельга дапусціць страты ўласнага твару і ўнутранага стрыжня — усяго таго, што складае духоўны код нацыі".

►►► 2 стар.

# Аляксандр ЛУКАШЭНКА:
# "Беларуская культура павінна служыць крыніцай маральнага вопыту і асновай духоўнага яднання народа"

◄◄◄ 1 стар.

На думку кіраўніка дзяржавы, культура валодае вялікай уладай, і таму яе аўтарытэт у грамадстве павінен пашырацца і мацнець. Яна будзе і далей развівацца ў атмасферы наватарскага пошуку і дабратворнай канкурэнцыі, павагі права мастака на творчую свабоду.

"Але пры гэтым мы катэгарычна супраць расколу майстроў мастацтва па палітычных матывах. Спробы ўзвесці бар'еры паміж уладай і інтэлігенцыяй бесперспектыўныя", — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што чалавек фарміруецца перш за ўсё ў культурным асяроддзі, і ад стану гэтага асяроддзя шмат у чым залежыць, у якім грамадстве мы будзем жыць у найбліжэйшыя дзесяцігоддзі і ў якім грамадстве будуць жыць нашы дзеці.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў: "Мы заўсёды падтрымаем тварцоў-патрыётаў, людзей светлага, стваральнага таленту, каб беларуская культура і далей служыла крыніцай маральнага вопыту і асновай духоўнага яднання народа".

"Падобна да таго, як у Бібліі горад трымаецца на праведніках, так і любы народ трымаецца на сваіх героях. І сёння мы ўшаноўваем тых, каго з поўным правам можна назваць героямі нашага часу. Сапраўдных падзвіжнікаў, якія заўсёды адгукаюцца на чужую бяду і спяшаюцца на дапамогу тым, каму яна асабліва патрэбна", — адзначыў прэзідэнт.

"Сярод лаўрэатаў прэмій "За духоўнае адраджэнне" — урачы гомельскага цэнтра "Шлюб і сям'я", якія дапамагаюць атрымаць шчасце мацярынства, дырэктар Радашковіцкай школы-інтэрната, які замяніў бацьку дзясяткам сірот. Рэстаўратары, што зберагаюць бясцэнныя гістарычныя рэліквіі, і служыцелі царквы, чыё прызначэнне — рабіць дабро. Дзякуй усім вам за шчодрасць душы", — сказаў прэзідэнт.

Мінулы год прайшоў у нашай краіне пад знакам кнігі. Невыпадкова прызнанне дзяржавы таксама атрымалі лаўрэаты спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва, чые дасягненні натхнёны любоўю да літаратуры і творчай спадчыны народа.

Заслужаныя ўзнагароды ўручаны майстрам Вялікага тэатра оперы і балета і тэатра-студыі кінаакцёра, якія далі сцэнічнае жыццё творам беларускай класікі, супрацоўнікам Нацыянальнай бібліятэкі і музея Янкі Купалы — за важкі ўклад у прапаганду мастацкага слова, а таксама іншым яркім творчым асобам і выдатным калектывам. "Краіна ўдзячна вам за працу і талент", — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх з высокімі ўзнагародамі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што каштоўнасць прэмій вымяраецца не толькі ў грашовым эквіваленце: "Дзякуючы ўзнагародам, аб заслугах лаўрэатаў даведаецца ўся Беларусь, і вы станеце прыкладам для маладых".